2. *Иванова, Т. В.* Ментальность, культура, искусство / Т. В. Иванова // Общественные науки и современность. – 2002. – № 6. – С. 168–177.

3. *Крылов, А. А.* Человек и культура [Электронный ресурс] / А. А. Крылов // PsyEra.ru : гуманитарно-правовой портал. – Режим доступа : https://psyera.ru/6074/chelovek-i-kultura.

4. *Руднев, В.* Философия языка и семиотика безумия : Избранные работы / В. Руднев. – М. : Изд. дом «Территория будущего», 2007. – 528 с.

5. *Степин, В. С.* Конструктивные и прогностические функции философии / В. С. Степин // Вопросы философии. – 2009. – № 1. – С. 5–10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІДЭЯ АБ ЗВЫШЧАЛАВЕКУ Ў ГЕНЕЗІСЕ НЯМЕЦКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУР

***Т. С. Супранкова,***
*старшы выкладчык кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

Аўтарам ідэі аб звышчалавеку з’яўляецца вялікі Гётэ, менавіта ў «Фаўсце» ім быў прапанаваны ўпершыню гэты вобраз (так Дух Зямлі называе галоўнага героя: «Цябе, звышчалавек, скруціў мізэрны страх» (пер. В. Сёмухі)) [1, с. 166]. З лёгкай рукі слыннага майстра слова ідэя разрастаецца далей ў прадмет філасофскіх разважанняў. Выспяваючы ў недрах нямецкай культуры, яна прасочваецца ў нацыянальныя літаратуры іншых еўрапейскіх народаў, у тым ліку і беларусаў.

Вобраз чарнакніжніка Фаўста з’яўляецца на нямецкай глебе яшчэ ў часы позняга Сярэднявечча і афармляецца ў эпоху Адраджэння («Гісторыя доктара Ёгана Фаўста, знакамітага чарадзея і чарнакніжніка», 1587). Версіі сюжэта аб Фаўсце да Гётэ былі даволі разнастайнымі і нават палярнымі: ад спробы рэзкай крытыкі нягодных паводзінаў бязбожніка, які захацеў спазнаць свет, да спачування і апраўдання вялікага ў сваіх памкненнях і годнасці Чалавека.

Ёган Вольфганг фон Гётэ стварыў цэласны і завершаны вобраз галоўнага героя, а таксама шэдэўр фаўсціяны ў сусветнай літаратуры. Для яго праца над гэтым творам стала справай усяго жыцця і цягнулася каля шасцідзесяці год, аж да смерці. Гётэ ў якасці галоўнай ідэі твора разглядае прычыну апраўдання Фаўста ў яго імкненні да пазнання свету, у спробах

знайсці праўду, спасцігнуць ісціну. Новай была інтэрпрэтацыя вобраза Мефістофеля:

> Я дух, што адмаўляе вечна…
> Частка сілы той ліхой,
> Дабро ўтвараецца з якой» [1, с. 191].

Ён – не чорт народных легендаў, а дыялектычнае адзінства дабра і зла. Услед за вобразам Сатаны са «Страчанага раю» Дж. Мілтана Мефістофель увасабляе тое зло, без якога нельга спасцігнуць дабро. Як адзначае беларуская даследчыца Г. В. Сініла (Крупкіна), Мефістофель – «тое адмаўленне, без якога немагчыма сцвярджэнне, тое разбурэнне старога, без якога немагчыма імкненне да новага... Дарэчы, і ў душы Фаўста жыве пэўны мефістофелеўскі пачатак. У гэтым сэнсе можна весці гаворку пра тое, што Мефістофель выступае двайнікам Фаўста, што Фаўст і Мефістофель увасабляюць два бакі адзінага жыцця, дзве палавінкі чалавечай душы» [2, с. 34]. Вялікі мысляр Асветніцтва Ё. В. Гётэ першым стварае ў «Фаўсце» з міфаў філасофскія канцэпцыі.

Эстэтыка рамантычнага накірунку падпітвалася крыніцамі асветніцкай культуры, вяла палемічны дыялог з ёю і ў сваіх мастацкіх пошуках спрабавала пераасэнсаваць вобразы, матывы, топасы, стылістыку і жанравыя напрацоўкі папярэдніх эпох. Асаблівым аб’ектам палемікі і дыялогу стала творчасць Ё. В. Гётэ. Першая частка «твору ўсяго жыцця» Гётэ пабачыла свет у 1808 г. (да гэтага ў 1790 г. выйшаў «Фаўст. Фрагмент»), пад гэтым уплывам некаторыя рамантыкі паспрабавалі стварыць сваю інтэрпрэтацыю слыннага нямецкага сюжэта: «Фаўст» А. фон Шамісса (1803), «Мемуары сатаны» В. Гаўфа (1827), «Дон Жуан і Фаўст» Х. Д. Грабе (1828), «Фаўст» Н. Ленаў (1836) і інш. Трэба адзначыць, што музычны «Фаўст» (1808–1833), опера кампазітара А. Г. Радзівіла, лібрэта да якой стварыў сам Ё. В. Гётэ, таксама ў першую чаргу адчувае на сабе эстэтыку рамантызму.

У культуры беларускага рамантызму гэта тэма таксама не магла не знайсці пэўны водгук. У паэме «Дзяды» А. Міцкевіча гэта праяўляецца ў міфалагізацыі свету, у вобразах герояўбунтароў, якім блізкі фаўстаўскі скептыцызм і адначасова з гэтым спроба перастварэння свету. І «Дзяды», і верш «Пані Твардоўская», звяртаючыся да вобразаў Фаўста і Мефістофеля,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даюць іх інтэрпрэтацыю ў нацыянальным рэчышчы, робячы акцэнт больш не на агульным, а на канкрэтных гісторыка-культурных рэаліях з беларускага ці польскага жыцця. Сусвет і месца чалавека ў ім цяпер разглядаюцца А. Міцкевічам з пазіцый народнага досведу, знайшоўшага адлюстраванне ў фальклорных легедах, паданнях, песнях і забабонах. Рамантыку Я. Баршчэўскаму таксама блізка міцкевічава асэнсаванне топасу фаўсціяны і яго асноўнай ідэі – героя-бунтара, своеасаблівага звышчалавека. У шмат якіх яго апавяданнях героі свядома ідуць на кантакт з сіламі цемры. У яго інтэрпрэтацыі гэта трактуецца як здрада сваёй радзіме, страта сваёй сапраўднасці [4, с. 405–408].

Нямецкі філосаф Ф. Ніцшэ, які аказаў значны уплыў на эстэтыку мастацтва і літаратуры дэкадансу і мадэрнізму, яскрава праінтэрпрэтаваў гётэўскую ідэю аб звышчалавеку ў працы «Так сказаў Заратустра» («Also sprach Zarathustra»), але ў адрозненне ад гётэўскага героя, які жыве ў міры з чалавекам, Ф. Ніцшэ заклікае пераадолець чалавека. Калі ў Фаўсце Гётэ жывуць «дзве душы», у якіх змагаецца дабро і зло, то Заратустра становіцца «па той бок дабра і зла». Заратустра, як і Фаўст, прагне вышэйшага Пазнання. Але, калі Фаўста не задавальняюць проста кніжныя веды і ён спрабуе спасцігнуць свет ва ўсёй яго паўнаце, выклікаючы духаў, заключыўшы дамову з Мефістофелем, прайшоўшы праз каханне і свет жывёльных жарсцяў, праз выпрабаванне ўладай і будаўніцтва лепшай будучыні на зямлі, то Заратустра падчас свайго пустэльніцтва спасцігае Новае Пазнанне, якое мусіць прывесці чалавецтва да новай эры звышчалавека. Фаўст «гётэўскай» эпохі (Новага часу) не ўсведамляе сябе па-за дзейнасцю ў гэтым свеце, на карысць людзей, на карысць грамадству. Яго апошняя выснова – пабачыць «народ свабодны на зямлі свабоднай», да чаго імкнулася ўся эпоха Асветніцтва, усе рэвалюцыі Новага часу. Мэта Заратустры – пераадолець чалавека, стары свет з яго шаблонамі і ментальнымі ўстаноўкамі. Яго філасофія скіравана ў першую чаргу на індывіда, і ў XX ст. можна пабачыць, як гэтыя індывіды, праінтэрпрэтаваўшы ідэі Ф. Ніцшэ, «вырашылі» праблему звышлюдзей (Uebermenschen) і недалюдзей (Untermenschen).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звышчалавек з’яўляецца носьбітам іншай (новай) свядомасці, іншага жыцця: «Заратустра глядзеў на людзей і дзіву даваўся». Пасля ён сказаў так: «Чалавек – гэта вяроўка, напятая паміж жывёламі і Звышчалавекам, вяроўка над прорваю. Небяспечна ісці, небяспечна станавіцца на пераходзе, небяспечна азірацца, небяспечна баяцца і спыняцца. Велічнае ў чалавеку тое, што ён мост, а не мэта: што вартае ў чалавеку любові, дык гэта тое, што ён – пераход і захад» [3]. Недарма Заратустра прадстае як новы Маісей з новымі запаведзямі. Ён пагарджае са сваёй маральнай вышыні нягоднымі чалавечымі законамі, законамі паміраючага жыцця, фікцыі. Звышчалавек свабодны ад усіх чалавечых забабонаў, нават ад Бога. Паводле Ф. Ніцшэ, яму супрацьпастаўлены карыкатурны вобраз «апошняга чалавека» – гэта ўвасабленне натоўпу, шэрых людзей. Канатны танцор для іх бліжэй, чым філосаф Заратустра. Стварэнне ж новага жыцця павінна засноўвацца не на розуме, а на інстынкце жыцця і на свабодзе. Ф. Ніцшэ ўяўляе жыццё як вечны рух, станаўленне, дынаміку. Розум не ў сілах спасцігнуць гэтую вечную зменлівасць, ён хоча «спыніць імгненне». Таму свет, створаны інтэлектам, – міраж, а сапраўднае быццё – вечнае станаўленне. Спасцігнуць ісціну немагчыма, бо гэта – падман. Ісціна забівае жыццё, за яе пошукамі скрываецца воля да смерці. Спасціжэнне заўсёды трагічнае, паколькі гэты працэс знішчае рэчы, а трэба імкнуцца распусціцца ў іх. Ф. Ніцшэ стаў тым, хто паўплываў на аддзяленне старой эпохі ад новай, зафіксаваў адчуванне заняпаду эпохі, яе крызіс.

Нямецкі культуролаг XX ст. О. Шпэнглер, які лічыў сваімі духоўнымі настаўнікамі Гётэ і Ф. Ніцшэ, стварыў канцэпцыю культуры і цывілізацыі ў грунтоўнай працы «Захад Еўропы» («Der Untergang des Abendlandes» адэкватней было б перакласці як «Заняпад Еўропы»). Заняпад не разумеецца аўтарам як знішчэнне фізічнае, але як «завяршэнне», пераход ад культуры да цывілізацыі, паколькі апошняя не можа стварыць нічога новага, а толькі інтэрпрэтаваць існуючыя формы і артэфакты. Фаўстаўскую душу О. Шпэнглер характарызуе як бязмежную прастору, «целам» якой з’яўляецца заходняя культура. Гэта душа адзіноцтва, таму заходнееўрапейская культура – культура індывідуалізму.

Цікавай у гэтым плане інтэрпрэтацыяй прадстае фаўсціяна ў творчасці нобелеўскага лаўрэата Т. Мана, які пасля заканчэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другой сусветнай вайны ў рамане «Доктар Фаўстус» прадставіў сваю версію дамовы генія са зладзействам. Як верны вучань Ё. В. Гётэ пісьменнік бачыць сваёй задачай паказаць не столькі ўніверсальную, а сучасную сітуацыю, Германію і нямецкае грамадства, дзе адораныя людзі ўпускаюць інфернальнае ў сваё жыццё. Следуючы за логікай О. Шпэнглера, перад намі прадстаўлены Фаўст канца еўрапейскай цывілізацыі (калі Фаўста народнай легенды разглядаць як героя яе пачатку – Сярэднявечча). Фаўстус-Леверкюн, звышчалавек Т. Мана, – вобраз сабіральны, у ім сінтэзавана біяграфія Ф. Ніцшэ, А. Шёнберга і іншых выбітных прадстаўнікоў эпохі. Сам раман з'яўляецца спробай асэнсаваць віну Германіі, калі геніі заключылі дамову з чортам.

У Ул. Караткевіча можна ўбачыць фаўсціянскія матывы і звязаную з імі ідэю звышчалавека. Самым яскравым пераасэнсаваннем сусветнай, у тым ліку і гётэўскай, фаўсціяны, на наш погляд, з'яўляюцца «Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны» (1961) і «Ладдзя роспачы» (1968). Галоўны герой легенды праходзіць шлях ад чорта да Чалавека, ад Мефістофеля да Фаўста: Рагач – ён жа Андрэй Рогач, ён жа магнат Андронік Рагінскі, ён жа кароль Андронік І. У Гервасія Вылівахі таксама ёсць нешта і ад Фаўста, і ад Мефістофеля. Заўважым, што асноўнаму, чаму насуперак жаданням Сатаны і пекла вучыцца Рагач, тоесна мефістофелеўскаму злу, з якога ўтвараецца дабро. У легендзе менавіта ён спараджае святло, з чорта ператвараецца ў Чалавека, імкнецца зрабіць свет лепшым. Таму аўтар легенды так ясрава іграе на кантрасце пачатка, прадстаўленага пеклам і змрочнымі замалёўкамі на зямлі, дзе таксама пануе пякельны агонь войнаў, і канца, калі апісвае той зямны рай, які здольны стварыць той, хто любіць сваю Бацькаўшчыну [4, с. 409–410].

Абазначаная яшчэ ў Гётэ ідэя Фаўста-звышчалавека эвалюцыянуе да складанейшых асэнсаванняў нямецкімі філосафамі XIX–XX ст. Ф. Ніцшэ і О. Шпэнглерам і ўплывае на іншыя нацыянальныя культуры спачатку праз эстэтыку рамантызму, далей праз філасофскія канцэпцыі Найноўшага часу.

1. *Гётэ, Ё. В.* Выбраныя творы / Ё. В. Гётэ ; уклад., прадм. Л. Баршчэўскага і П. Копанёва, камент. Л. Баршчэўскага і В. Сёмухі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1999. – 365 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Крупкіна (Сініла), Г.* Мастацкі космас гётэўскага «Фаўста» і яго перастварэнне па-беларуску / Г. Крупкіна // Роднае слова. – 2000. – № 7. – С. 29–34.

3. *Ніцшэ, Ф.* Так сказаў Заратустра [Электронны рэсурс] / Ф. Ніцшэ ; пер. з ням. В. Сёмухі // Літаратура.org. – Рэжым доступу : http://litaratura.org/syomukha?artid=133. – Дата доступу : 23.10.2015.

4. *Супранкова, Т. С.* Фаўсціяна ў беларускім рамантычным дыскурсе / Т. С. Супранкова // Национальные культуры в межкультурной коммуникации : сб. науч. ст. : в 2 ч. – Ч. 2. Национальные формы художественной культуры в процессе межкультурного взаимодействия / редкол.: Э. А. Усовская (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2016. – С. 403–410.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГУМАНИЗАЦИЯ ОБЩЕСТВА В КОНТЕКСТЕ ФИЛОСОФИИ БУДУЩЕГО

***В. А. Тихонова,***
*доктор философских наук, профессор,*
*Почетный работник высшего профессионального образования Российской Федерации, заведующий кафедрой социально-философских наук Московского государственного института культуры*

Проблема будущего всегда занимала значительную роль в философских исследованиях, посвященных поиску ответов на вопросы: по какому пути пойдет человечество, каков он – человек будущего? Особое внимание эта проблема привлекала к себе в переходные исторические периоды, когда в процессе изменяющегося курса общественного развития зачастую усиливались надежды на возможность разрешения прежних противоречий, несправедливостей, исполнения желаний о «вечном мире» и благополучной жизни. Значительно актуализировалась эта проблема в современных условиях развития глобализационного процесса, учитывая, что теория глобализации в своей основе формировалась на постулатах взаимодействия, взаимоуважения, равенства всех субъектов международных отношений, на создании благоприятных условий для жизни и развития различных стран и народов мира. Предполагалось, что постиндустриальная стадия цивилизации и является основой, трамплином для наступления ожидаемого светлого будущего. Однако реальность оказалась далека от идейных конструкций, теоретических моделей, заключенных в различных